© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA" („VATERLAND")
Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna" („Das Vaterland"), (13 b) München 19, Schliessfach 69.

Druck: „LOGOS", Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14

Цана: **Нямеччына:** на год — 14,— м.; 6 м-цаў — 7,50 м.; 3 м-цы — 4,25 м.; **ЗША і Канада:** на год — 8,— д.; 6 м-цаў — 4,50 д.; 3 м-цы — 2,50 д.; 1 нумар — 0,20 д. **Ангельшчына й Аўстралія:** 39 шыл.; 21 шыл.; 12 шыл.; 1 шыл. **Бэльгія:** 210 фр.; 120 фр.; 75 фр.; 5 фр. **Францыя:** 800 фр.; 450 фр.; 250 фр.; 20 фр. **Аргентына:** 80 пэз.; 45 пэз.; 25 пэз.; 2 пэз. **Перасылка лётніцкай поштай каштуе падвойна. Падвойныя нумары каштуюць падвойна. Паадзіночныя нумары газэты разам з «Каласкамі» ўважаюцца за падвойныя.**

Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna", Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE" | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "THE FATHERLAND"

№ 39 (425) Нядзеля, 12 кастрычніка 1958 ГОД ВЫДАНЬНЯ 12

Балючая страта для чалавецтва

Папа Пій XII ня жыве

У чацьвер 9-га кастрычніка 1958-га году на восемдзесят другім годзе свайго жыцьця памёр Папа Пій XII.

Нятолькі каталіцкая Царква, але і ўсё чалавецтва страціла ў Адыйшоўшым аднаго зь Вялікіх нашага часу.

Пастыр 450 мільёнаў каталікоў, Пій XII, быў 261-м рымскім папам, займаючы пасад Сьвятога Пятра ад 1939-га году.

Адданасьць хрысьціянскай справе, нутраная сіла й нязвычайны розум ставяць Памерлага ў лік найбольш выдатных папаў.

Эўджэньё Пачэлі — запраўднае імя папы Пія XII — нарадзіўся ў Рыме 2-га сакавіка 1876 году й быў трэцім дзіцём папскага кансыстарыяльнага адваката Філіпа Пачэлі. Ведамая сям'я Пачэлі ўжо ад некалькіх пакаленьняў была на службе Курыі, а дзед Памерлага быў заступнікам міністра нутраных справаў Ватыкану.

Свае дзіцячыя гады малы Эўджэньё гравёў ў Онано. Потым прыйшлі гімназіяльныя гады ў Рыме. Гімназію Эўджэньё закончыў у 1894-м годзе як найздальнейшы першы вучань, у выніку чаго ягоныя настаўнікі раілі яму аддацца навуковай дзейнасьці.

У кастрычніку 1894 году васемнаццацігадовы Эўджэньё запісваецца на ўнівэрсытэт, дзе яго асабліва цікавіць царкоўнае права й дыпляматыя, ды дзе атрымоўвае навуковыя тытулы доктара тэалёгіі й доктара права.

Другога красавіка 1899 малады акадэмік быў пасьвечаны на сьвятара. Дзякуючы здольнасьцям і беззаганным якасьцям характару, у даволі хуткім часе Яго прыймаюць у сябры Кангрэгацыі для адмысловых царкоўных справаў, ды робяць выкладчыкам царкоўнага права й дыпляматыі ў папскай Акадэміі ў Рыме.

У 1912-м годзе Яму даручаюць функцыю сакратара сваёй кангрэгацыі ды ўводзяць у камісію кадыфікацыі царкоўнага права. Пяць гадоў пазьней Папа Бэнэдыкт XV надае Яму сан біскупа ды хутка пасьля гэтага прызначае Яго на становішча папскага нунцыя ў Мюнхэне.

У Мюнхэне нунцыя Пачэлі застае камуністычная рэвалюцыя, якая тут выбухла 8-га лістапада 18-га году. І хоць на паседжаньні жаўнерскай рады было пастаноўлена арыштаваць яго, ставячы яму ў закід шпіёнскую дзейнасьць, аднак чырвоныя не адважыліся пайсьці на такую правакацыю.

У 1920-м годзе біскуп Пачэлі, як папскі нунцый пераводзіцца ў Бэрлін, дзе застаецца да 1929-га году, калі Яго Папа Пій XI адклікае ў Рым ды надае Яму годнасьць кардынала. Хутка пасьля гэтага кардынал Пачэлі атрымоўвае становішча дзяржаўнага сакратара, або дыпляматычнага кіраўніка Ватыкану.

9-га лютага 1939-га году, пасьля сьмерці папы Пія XI, кардынал Пачэлі быў выбраны папам і прыняў імя Пія XII.

Як Галава Каталіцкай Царквы, Пій XII увёў шэраг новых рэформаў. Прыкладам, першы раз ад XIV стагодзьдзя італьянскія кардыналы становяць мяншыню, навет няпоўную трэціну, у Калегіі Кардыналаў, і першы раз у гісторыі папа ўвёў у годнасьць кардыналаў Кітайцаў, Афрыканцаў, Гіндусаў.

У нашыя часы Пій XII быў яскравым прыкладам бескампраміснага змаганьня супраць усякага таталітарызму. Усім ведамае Ягонае становішча да фашызму й нацызму, як і Ягоны дэкрэт аб экскамунікацыі тых каталікоў, якія належаць да камуністычнай партыі, або вядуць камуністычную прапаганду.

Будучы чалавекам сучаснасьці, Ён жыва цікавіўся вялікімі праблемамі сяньняшняга дня ды стараўся знайсьці разьвязку для шэрагу пытаньняў, перад якімі апынулася чалавецтва, ды асабліва пытаньняў сацыяльных і тых, што вынікаюць із сяньняшняга матар'яльна-тэхнічнага разьвіцьця й прагрэсу.

Зусім таму зразумела, што калі сьвет абляцела сумная вестка аб цяжкай хваробе Пія XII, мільёны вернікаў малілася Богу за Яго выздараўленьне, а галовы дзяржаваў, і то ня толькі хрысьціянскіх, пераслалі ў Ватыкан свае тэлеграмы з пажаданьнямі выздараўленьня.

Усемагутны хацеў інакш. Ён паклікаў Свайго Слугу ў Сваё Каралеўства.

Сяньня Каталіцкая Царква ў цяжкай жалобе. Але й некаталікі падзяляюць гэтую жалобу ды далучаюць свае малітвы за Вечны Супакой Вялікага Адыйшоўшага.

Дзякуючы ведамай прыхільнасьці й жывой зацікаўленасьці лёсам усіх паняволеных народаў, у тым ліку й народу беларускага, ды нязломнаму змаганьню за правы й справядлівасьць для кажнага пакрыўджанага, Папа Пій XII стаўся для гэтых народаў увасабленьнем Справядлівасьці, Абаронцам, Надзеяй. Тым больш балюча адчуваем мы сяньня Ягоную сьмерць.

✶

Пасьля сьмерці папы Каталіцкай Царквой кіруе Калегія Кардыналаў, дэканам якой зьяўляецца цяпер кардынал Тысэран, і ў якую сяньня ўваходзяць 55 кардыналаў. Улада-ж у Ватыкане пераходзіць цяпер да гэтак званага Камэрленго, які звычайна вызначаецца яшчэ падчас жыцьця папы. У сувязі з тым, што Пій XII ня вызначыў нікога на гэтае становішча, Камэрленго быў выбраны прысутнымі кардыналамі.

Да абавязкаў Камэрленго належыць афіцыяльнае сьцьверджаньне сьмерці папы ды кіраваньне ўсімі рытуаламі аж да часу выбару новага папы.

Пасьля пахаваньня папы, якое суправаджаецца шматлікімі рытуаламі, уся ўвага сьціроўваецца на выбар новага папы.

Новы папа выбіраецца у гэтак званай Конкляве. Ён мусіць атрымаць дзьве трэція плюс адзін голас прысутных кардыналаў. Асаблівасьцяй Конклявы зьяўляецца поўная адызаляванасьць ад вонкавага сьвету. Гэта робіцца дзеля таго, каб не дапусьціць ніякіх вонкавых уплываў ды даць патрэбны супакой для абмеркаваньня выбару. Цэнтрам Конклявы зьяўляецца Сыкстынская Капліца ў Ватыкане. Кажны кардынал атрымоўвае адасобнены пакой. Кажны зь іх можа мець з сабой сакратара й слугу, сярод якіх ня могуць быць ні пралаты ні сваякі кардынала. За тэхнічны бок выбару адказвае Маршал Конклявы. Конклява пачынаецца Багаслужбай, якую служыць Дэкан кардыналаў. Пасьля казаньня, у якім прыгадваецца абавязкі й адказнасьць кардыналаў, усе тыя, якія не належаць да Коклявы мусяць выйсьці з Сыкстынскай Капліцы. Камэрленго-ж спраўджае, ці прысутныя ня маюць фатаграфічных апаратаў, фанаграфаў і іншых. Усе асабістыя нататкі, робленыя ў часе Конклявы, пасьля выбару папы мусяць быць спаленыя. Прысутным войстра забараняецца расказваць аб тым, што дзеялася падчас Конклявы.

Выбіраньне папы пачынаецца наступнай раніцой. Яно адбываецца тайна, падаваньнем на лісткох паперы імёнаў кандыдатаў. На адмысловым стале стаіць вялікая чаша, якая зьяўляецца урнай. Уздоўж сьцен пад бальдахімамі сядзяць кардыналы. Майстры цырымоніі раздаюць картачкі і астаўляюць кардыналаў саміх. Пад напісанай на картачцы формулай „Eligo in Summum Pontificem" ... («Я выбіраю папам ...» кажны з кардыналаў ставіць імя свайго кандыдата. Пасьля прысягі; «Я бяру Госпада Хрыста, які мяне судзіць будзе, на сьветку, што я выбіраю таго, каго перад Богам лічу за свой абавязак выбраць», кардыналы кідаюць свае карткі ў чашу. Адмыслова выбраныя перад гэтым кардыналы падлічваюць галасы. Зь першага выбару пераважна няма патрэбных дзьве траціны галасоў.

Калі першае галасаваньне ня прыносіць кандыдату належнае бальшыні, дык усе карткі з галасаваньня ўкідаюцца ў печ, якая стаіць ля аўтара ў Сыкстыне, і там спальваюцца разам з сырым сенам і саломай. З коміну Сыкстыны, які можна бачыць з пляцу Базылікі сьв. Пятра, ідзе тады чорны дым, і гэта значыць, што галасаваньне ня прынясло належных вынікаў. Калі-ж кандыдат атрымоўвае патрэбную бальшыню галасоў, тады карткі галасаваньня спальваюцца без ніякіх дамешак і белы дым, які паўстае з гэтага, ёсьць знакам, што новы папа ўжо выбраны. Дэкан кардыналаў пытае тады выбранага, ці ён гэты выбар прыймае. Калі запытаны выкажа згоду, ён стаецца папам і падае да ведама сваё новае імя. Звычайна тыдзень пазьней адбываецца каранацыя нававыбранага папы.

Юбілейны хвальш і запраўднасьць

(Заканчэньне з папярэдніх нумароў)

У перанесеных зь Менску ў Рыгу мірных перамовах між Савецкай Расеяй і Польшчай Беларусы ня прымалі ніякага ўдзелу, хоць гэтыя перамовы й вырашалі лёс беларускага народу. І гэта не таму, што, давяраючы Расеі, беларускі народ быццам-бы перадаў свае паўнамоцтвы расейскай дэлегацыі, як аб гэтым гаворыць сучасная беларуска-савецкая гістарыяграфія. Ніхто ў Беларусаў ня пытаўся гэтых упаўнаважаньняў і ня лічыўся зь беларускім голасам, хоць такі голас даваў аб сабе знаць навет і ў афіцыйных пастановах. Напрыклад, мы маем наўвеце пастанову III зьезду Саветаў Менскага павету, што адбыўся ў першай палове сьнежня 1920 году. У гэтай пастанове гаварылася паймена, што зьезд Саветаў «лічыць, што Беларусь павінна быць непадзельнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай у ейных этнаграфічных межах» ды што «на мірную канфэрэнцыю, дзе вядуцца перамовы пра лёс Беларусі ... павінна быць пасланая ад БССР мірная дэлегацыя». Як ведама, гэтыя перамовы закончыліся падпісаньнем 18 сакавіка 1921 году мірнае ўмовы між Расеяй і Украінай з аднаго боку й Польшчай з другога. Згодна гэтае ўмовы ўся Заходняя Беларусь амаль не да Менску адыйшла да Польшчы. БССР засталася ў межах толькі шасьці паветаў Менскай губэрні.

Апынуўшыся перад такім фактам патаптаньня нацыянальных правоў народу, беларуская грамадзкая апінія, у тым ліку й беларускія нацыянал-камуністыя, з самага пачатку сталі дамагацца далучэньня ўсходніх беларускіх этнаграфічных земляў да БССР. За гэтыя дамаганьні навет быў расстраляны камісар нацыянальных справаў БССР Фабіян Шантыр, аднак гэта не запалохала беларускае грамадзтва. Пытаньне далучэньня ўсходніх земляў, захопленых РСФСР, падымаецца зноў ў 1921 гаду на X партыйнай канфэрэнцыі КП(б)Б, і больш станоўча ў 1923 гаду — на XII партыйнай канфэрэнцыі камуністычнай партыі Беларусі. У рэзалюцыі апошняй зазначалася паймена, што «хутка паставіць на ногі Савецкую Беларусь можна толькі ўключыўшы ў тэрыторыю Беларусі родныя ёй суседнія раёны ... У прыватнасьці, у адносінах Беларусі, належыць разьвязаньню пытаньне аб канчатковым акрэсьленьні ейнай тэрыторыі шляхам уключэньня ў склад Беларусі родных ей суседніх раёнаў». Аналягічныя пастановы прыймаюцца адначасна на зьездах саветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай вобласьцяў ды іхнімі губкомамі партыі. Із свайго боку скліканы ў студзені 1924 году V Усебеларускі зьезд Саветаў даручае Ураду БССР распачаць перамовы з урадам РСФСР у справе актуальнага пашырэньня межаў БССР. Пад гэтым ціскам, а таксама выходзячы зь некаторых палітычных меркаваньняў адносна Заходняй Беларусі, ЦК РКП(б), і ўрад РСФСР нарэшце згаджаюцца на перагляд усходніх межаў БССР, ствараючы камісію з прадстаўнікоў БССР, РСФСР і УССР, якім даручаецца праводжаньне так званага плебісцыту на чыста этнаграфічных беларускіх землях. 3 сакавіка ЦВК СССР прыймае пастанову аб далучэньні да БССР цэлага шэрагу паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губэрняў, пакідаючы ў складзе РСФСР паўночна-ўсходнія паветы гэтых губэрняў. З гэтае нагоды й склікаецца на 13-16 сакавіка VI Усебеларускі Надзвычайны зьезд Саветаў ды які праходзіць зь нябывалай да гэтага часу помпай. Палітычны бок гэтае «ўрачыстасьці», як і самое згоды РСФСР, занадта відавочны, каб гаварыць аб іх як аб нацыянальным сьвяце беларускага народу й «дабравольнасьці» Расеі. На зьезьдзе прысутнічаюць старшыня ЦВК СССР Калінін, маршал Тухачэўскі й дзеячы Камінтэрну — Палякі Фэлікс Кон і Томаш Домбаль. На ім праслаўляецца са-

(Заканчэньне на 2-ой бачыне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Спадкаемнікі чарнасоценскай рэакцыі

У ньюёрскім «Новым Рускім Слове» за 20 жніўня сёлета быў надрукаваны жахлівы сваім палітычным зьместам дакумэнт, міма якога прайсьці ніяк нельга. Гэта была рэзалюцыя «амэрыканскіх грамадзян расейскага паходжаньня і расейскіх эмігрантаў», як яны самі сябе назвалі, згуртаваных аж у 23-ох розных расейскіх арганізацыях, пачынаючы ад манархістычных і канчаючы ўласаўскімі. Гэтая рэзалюцыя, прынятая на сходзе ў Нью Ёрку 2 жніўня сёлета, была заадрысаваная й перасланая Прэзыдэнту Задзіночаных Штатаў Амэрыкі. У ёй расейская нацыяналістычная рэакцыя ўзяла на сябе няслаўнае заданьне дамагацца ад Амэрыкі помачы дзеля трыманьня ў няволі ўсіх нерасейскіх народаў, што калісьці былі заваяваныя царскай Расеяй, а сяньня ўваходзяць у склад Савецкага Саюзу, і пагражаць Амэрыцы, што ў праціўным выпадку ўвесь расейскі народ наважана падтрымае бальшавікоў у выпадку збройнага зудару з Захадам. Гэтак, між іншым, у рэзалюцыі чытаем (дзеля дакладнасьці тэксту цытуем у арыгінале):

«Русский народ патриотичен и националистичен, что и было ясно доказано на деле во время Второй Мировой Войны. До тех пор пока политика США носит характер «расчленительный», Русский народ, несмотря на его ненависть к коммунистам, не может верить США и, волей-неволей, был бы принужден поддерживать Советское Правительство (у арыгінале абодвы словы зь вялікай літары — Рэд.), если бы дело дошло до вооруженного конфликта с Западом.

Такие действия США, как поддержка сепаратистских групп эмигрантов на своей территории и пропаганда сепаратизма по радио, оплачиваемая тем же Американским Правительством, служит лучшей опорой каммунистов внутри СССР.

Российский национализм — это могущественное оружие против коммунизма. Поэтому то, при правильной политике США лучшим союзником Американского народа против коммунистов был бы Русский народ.

Если бы Вы, Господин Президент, обратились бы к этому народу с призывом к дружбе и одновременно решительно осудили бы агрессивную сущность коммунизма, преследующего свою конечную цель — подчинение ему всего Мира — то Ваша встреча с Хрущевым или его представителями могла бы быть началом конца коммунизма.

Как лойяльные граждане США, как люди, знающие Россию и ее народ, мы считаем своим долгом обратить Ваше внимание на необходимость США изменить свою палитику по отношению к Русскому вопросу и раз навсегда отказаться от поддержки сепаратистской пропаганды».

Як бачым, уся гэтая рэзалюцыя наскрозь пранізаная грубым хвальшаваньнем гістарычных фактаў, бяспрыкладнай у нашыя дэмакратычныя часы рэакцыйнасьцяй палітычнай думкі, поўнай адсутнасьцяй палітычнай этыкі й маралі, а так-жа бессаромнай нахабнасьцяй палітычнага шантажаваньня.

Рэзалюцыя выразна абвінавачвае Амэрыку ў тым, што ейная палітыка носіць характар «расчленительный», на довад чаго прыводзіцца й такі факт, што быццам амэрыканскі ўрад дае падтрыманьне для «сэпаратыстычных груп эмігрантаў на сваёй тэрыторыі й вядзе прапаганду сэпаратызму па радыё, аплачываным тым-жа амэрыканскім урадам». Вось-жа гэтае абвінавачваньне Амэрыкі й ейнага ўраду проста выссанае з пальца. Як ведама, амэрыканскі ўрад сяньня ў дачыненьні да народаў Савецкага Саюзу прыдзержываецца т. зв. «палітыкі непрадрашэнства», пакідаючы справу разьвязаньня дзяржаўнага ладу паняволеных бальшавізмам народаў свабоднаму волявыяўленню гэтых народаў толькі пасьля іхнага вызваленьня.

Мы Беларусы, як і ўсе іншыя паняволеныя бальшавізмам народы, цьвёрда перакананыя, што такая палітыка амэрыканскага ўраду зьяўляецца няправільнай, бо яна самахоць адмаўляецца ад найвайстрэйшай зброі ў змаганьні з камунізмам, якой было-б належнае выкарыстоўваньне нацыянальна-вызвольных ідэяў нерасейскіх народаў. Камуністыя, як ведама, зь вялікім пасьпехам падміноўваюць пазыцыі Захаду на Сярэднім Усходзе, у Паўночнай Афрыцы і на Далёкім Усходзе якраз шляхам падтрымваньня й выкарыстоўваньня ня клясавых супярэчнасьцяў сярод насельніцтва гэтых тэрыторыяў, але іхных нацыянальна-вызвольных ідэяў.

Амэрыканская «расчленительная» палітыка, на жаль, сяньня абмяжоўваецца ўсяго толькі да спачуваньня паняволеным нерасейскім народам ды да радыёвай прапаганды ў іхнай роднай мове, пры гэтым прапаганды, якая старанна абмінае навет усякія намёкі на права да дзяржаўнай незалежнасьці гэтых народаў і іхнага аддзяленьня ад Расеі. Аказваецца, што й гэтыя, больш чымся сьціплыя тэндэнцыі амэрыканскага ўраду ў вачох 23-ох расейскіх арганізацыяў зьяўляюцца вялікім праступкам Амэрыкі ў дачыненьні да расейскага народу. Відаць расейскім шавіністым хацелася-б, каб амэрыканскі ўрад ня вызнаваў факту існаваньня навет моваў нерасейскіх народаў і ня ўжываў іх у сваёй радыёвай прапаганьдзе, чаго ня ў сілах быў зрабіць царскі ўрад пасьля рэвалюцыі 1905 г., які быў змушаны скасаваць забарону беларускае мовы ў друку. Расейскія шавіністыя ўважаюць за нармальнае зьявішча, калі-б урад Амэрыкі загарантаваў ім сваю актыўную помач у далейшым паняволеньні нерасейскіх народаў навет і пасьля зьнішчэньня бальшавізму. Вось тут і завяршэньне нябывалай дзікасьці расейскай нацыяналістычнай рэакцыі, далей якой ісьці ўжо нельга!

Подлым шантажом і яўным хвальшаваньнем гістарычнай праўды зьяўляецца пагроза пад адрысам Амэрыкі, што ў выпадку прадаўжэньня існуючай у ЗША палітыкі, якую рэзалюцыя называе сэпаратыстычнай і «расчленительной», расейскі народ «быў-бы змушаны падтрымваць савецкі ўрад, калі-б дайшло да збройнага канфлікту з Захадам». Калісьці Керанскі быў выразіўся, што «лучше плохой диктатор, чем рвать на куски живое тело России», падразумляючы пад дрэнным дыктатарам Сталіна. Але гэтыя рэакцыйныя словы, якія сталіся пазьней крылатымі словамі ў дачыненьні і да Керанскага, і да ўсёй расейскай нацыяналістычнай рэакцыі, былі выказаныя прыватна й маглі зьявіцца пад уплывам часовай эмоцыі. «Амэрыканскія грамадзяне расейскага паходжаньня і расейскія эмігранты» зьвяртаюцца із сваімі словамі зусім афіцыяльна да Прэзыдэнта ЗША — палітычнага правадыра й галоўнага рэпрэзэнтанта ўсяго амэрыканскага народу. Іменна гэтая акалічнасьць мае сваю глыбокую вымову!

Што-ж датычыцца «патрыятычнасьці й нацыяналістычнасьці» расейскага народу ў тым значаньні, якое гэтым словам прыдаюць 23 расейскія арганізацыі, дык вельмі многа можна было-б прывесьці нязьбітых довадаў і фактаў, якія гавораць якраз адваротнае. З прычыны нястачы месца прывядзём толькі два.

На падмацаваньне свайго цьверджаньня аб «патрыятычнасьці й нацыяналістычнасьці» расейскага народу рэзалюцыя паклікаецца на яго паступаньне ў часе Другой Сьветавай Вайны. Але аўтары рэзалюцыі, відаць, забыліся або думаюць, што забыліся іншыя аб тым, што паступаньне расейскага народу ў часе Другой Сьветавай Вайны ня мела абсалютна нічога супольнага з такой «патрыятычнасьцяй і нацыяналістычнасьцяй», якія маюць наўвеце расейскія нацыяналістычныя рэакцыянэры. Хаця пляны Гітлера ў дачыненьні да Савецкага Саюзу былі далёкія ад «расчленительных», хаця ня меў ён на мэце запраўднага вызваленьня ні расейскага, ні нерасейскіх народаў, усе народы Савецкага Саюзу ў пачатку гітлераўскага паходу на Ўсход моцна надзеіліся, што нямецкая палітыка будзе падтрымваць нацыянальна-вызвольныя імкненьні нерасейскіх народаў да дзяржаўнай незалежнасьці й аддзяленьня ад Расеі. Расейскія нацыяналістыя тэй-жа самай масьці, што й падпісаныя пад ньюёрскай рэзалюцыяй, пры кажнай іншай нагодзе любяць сяньня паклікацца на гэтую быццам сэпаратыстычную й «расчленительскую» розэнбэргаўскую палітычную канцэпцыю, якой у запраўднасьці ня было, але ў існаваньне якой спачатку верылі народы Савецкага Саюзу.

І вось-жа, ня гледзячы на гэтыя ўяўныя «расчленительные» пляны Гітлера, савецкія збройныя сілы, зложаныя ў вялізарнай бальшыні сваёй з Расейцаў, цэлымі палкамі, дывізіямі й навет арміямі, будучы дастаткова ўзброенымі, у першыя месяцы вайны дабравольна здаваліся ў палон Немцам на палёх Беларусі, Украіны й Прыбалтыкі. Гэтак яны рабілі хіба-ж не для абароны й ня ў імя таго найгоршага гатунку «патрыятычнасьці й нацыяналістычнасьці», якія прыпісваюць расейскаму народу аўтары рэзалюцыі.

Праўда, усе падсавецкія народы, а ў тым ліку й расейскі народ, з часам самаахвярна выступілі супраць гітлераўскага акупанта і тым самым, сьведама ці нясьведама, выдатна спрычыніліся да перамогі савецкай арміі. Але гэта сталася толькі тады і ў сувязі з тым, калі паводзіны нямецкага акупанта дастаткова паказалі, што ён ня толькі ня думае даць свабоды й дзяржаўнай незалежнасьці паняволеным народам, у роўнай меры нерасейскім, як і расейскаму, але плянуе адну няволю замяніць другой, можа навет яшчэ горшай за бальшавіцкую, і замяніць занятыя на Ўсходзе тэрыторыі ў калёніі нямецкага Райху.

Другі прыклад. У пэрыяд нацыянальнага адраджэньня нерасейскіх народаў царскае імпэрыі ані расейскі народ у сваёй масе, ані расейская прагрэсыўная інтэлігенцыя, якая, як ведама, гэтую народную масу рэпрэзэнтавала й прыгатавала ідэйны грунт для пазьнейшай рэвалюцыі, ніколі ня выступалі супраць нацыянальных ідэяў і вызвольных рухаў нерасейскіх народаў і не праяўлялі ніякай нянавісьці да нерасейцаў. Наадварот, расейская прагрэсыўная інтэлігенцыя й студэнцкая моладзь звычайна сымпатызавалі й спачувалі нацыянальным імкненьням нерасейскіх народаў і ня рэдка аказвалі ім помач. Носьбітамі нацыянальнага прыгнечаньня, палітычнага ціску й прымусовай русыфікацыі нерасейскіх народаў былі заўсёды палітыка царскіх урадаў, адміністрацыйны апарат імпэрыі й некаторая частка рэакцыйнай радавой інтэлігенцыі, якая й атрымала заслужаны ёю назоў чорнае сотні. Але ані царскі ўрад і ягоны адміністрацыйны апарат, ані чорная сотня ня выражалі волі расейскага народу, як таксама ў ніякім выпадку ня выражаюць волі й думак расейскага народу сяньняшнія верныя спадкаемнікі расейскай чорнай сотні — «амэрыканскія грамадзяне расейскага паходжаньня й расейскія эмігранты», што прынялі ньюёрскую рэзалюцыю.

Паклікаючыся на тое, што яны найлепей «знаюць Расею й яе народ», ды прысабечваючы сабе права прамаўляньня ад імя расейскага народу, гэтыя людзі якраз нявымоўна крыўдзяць і зьневажаюць расейскі народ, прыпісваючы яму найбольш адмоўныя якасьці. Ведамы ўкраінскі публіцыст М. Васкабійнік у № 70 за 18 верасьня газэты «Українські Вісті» гэтак трапна схарактарызаваў рэзалюцыю 23-ох расейскіх палітычных арганізацыяў:

«Дакумэнт, які мы цытавалі, ёсьць дакумэнтам нездаровага нацыяналізму, нацыяналізму імпэрыялістычнага, захланнага, нацыяналізму фашыстоўскага тыпу. Гэты дакумэнт варты таго, каб кажны трымаў яго ў сваёй памяці і ў сваіх паперах, як важны дакумэнт «воўчай маралі» так званых расейскіх «антыбальшавікоў-нацыяналістых».

І ўзапраўды, цьвяроза думаючаму нармальнаму чалавеку, які кіруецца сумленьнем і прынцыпамі этыкі, цяжка навет уявіць сабе, каб у палавіне дваццатага стагодзьдзя, у эпоху вызваленьня й эманцыпацыі ўсіх каляровых народаў, народаў зусім адсталых, знайшліся аж дваццаць тры палітычныя арганізацыі ў вольным сьвеце, якія ўважаюць за неабходнае паняволіць культурныя, нацыянальна й палітычна дасьпелыя народы, якія ў мінуласьці былі незалежныя й бальшыня якіх знаходзілася, й магчыма знаходзіцца сяньня на вышэйшай узроўні свайго разьвіцьця, чымся народ расейскі. Больш таго! Людзі й палітыкі з гэтых арганізацыяў ня толькі ўважаюць неабходным далейшае паняволеньне нерасейскіх народаў, але ім хапіла нахабнасьці патрабаваць, каб у гэтых няслаўных імкненьнях дапамагла ім Амэрыка, краіна якая, сталася сымбалем свабоды, справядлівасьці й прагрэсу. Такія патрабаваньні ад дзяржавы, якая ўзяла на сябе правадырства ўсяго вольнага сьвету й абарону яго перад нявольніцтвам, могуць рабіць або людзі псыхічна ненармальныя, або злой волі цынікі, што хочуць зьняважыць волялюбны амэрыканскі народ!

І яшчэ адно месца ў рэзалюцыі павінна зьвярнуць на сябе ўвагу кажнага. Гэта словы, у якіх аўтары рэзалюцыі намагаюцца пераканаць Прэзыдэнта Амэрыкі, што, у выпадку прыняцьця амэрыканскім урадам іхных пасуленьняў, ягоная «сустрэча з Хрушчовам або

(Заканчэньне на 3-ай бачыне)

Юбілейны хвальш і запраўднасьць

(Заканчэньне зь 1-ай бачыны)

вецкая нацыянальная палітыка, антыімпэрыялізм расейскага народу ды кідаюцца пагрозы ў бок Польшчы, якія напамінаюць апошняй пра незакончаны разьлік, што маскуецца тут беларускім пытаньнем. Важкім-жа аргумантам гэтага палітычнага шантажу й замаскаваньня тут зьяўляецца якраз сама прысутнасьць Калініна, маршала Тухачэўскага й польскіх камуністых Фэлікса Кона й Томаша Домбаля. Ня дзіва таму, што пасьля гэтае «ўрачыстасьці» ў Менску ў афіцыйных колах пачалі пагаварваць пра другі «Мангольскі праект» для Беларусі, г. зн. пра выхад БССР із складу СССР і ейную актуальную вайну з Польшчай за Заходнюю Беларусь, а беларуская нацыянальна-палітычная думка стала выпешчваць надзею здабыць пры дапамозе гэтага праекту незалежнасьць Беларусі. Думаем, што гэтыя слухі мелі нейкую рэальнасьць і сувязь із згодай Масквы вярнуць да БССР некаторыя ўсходнія беларускія землі.

Такім чынам ня выпадае супярэчыць гістарычнай праўдзе й сяньня праслаўляць палітычна-тэрытарыяльную незацікаўленасьць Масквы ды «запраўды народную» савецкую нацыянальную палітыку. Калі Масква й змушаная была пайсьці на некаторыя ўступкі, дык гэта рабілася з прымусу й разважанага палітычнага разьліку. Пра запраўднае-ж аблічча гэтае палітыкі сьветчаць беларуская Віленшчына й Беласточчына, перададзеныя Масквой Летуве й Польшчы, ды беларускія ўсходнія землі, якія й да сяньняшняга дня ўсьцяж знаходзяцца ў складзе РСФСР.

П. Залужны

Аляксей Кулакоўскі

ДАБРАСЕЛЬЦЫ 9)

— Як-жа гэта ты, а? — усё пытала яна, усьпёршыся рукамі на пляцень. — Як-жа гэта здарылася, Вася?

Прыклыпалі па гуртавых сьлядох Мітрафан з Платонам, убачылі, што начальства папалася, і пасунуліся моўчкі назад: далей ад граха, ад розных няпрыемнасьцяў. Па дарозе яны забралі з сабою бычка.

Даша ўсё дапытвалася, але Печка толькі плакаў, скардзіўся на свой лёс, а ў гаворку не ўдаваўся.

— Хочаш, мы дапаможам табе дайсьці дадому, — папрасіла дзяўчына, але Печка й на гэта нічога не адказаў.

Тады Цімоша, мабыць зразумеўшы, што хлапцу цяжкавата будзе рухацца сваім ходам, прапанаваў ісьці на калгасны двор па сані. Усе пабеглі, а каля плятня засталася адна Даша. Яна пераступіла цераз пляцень і блізка нахілілася над Васілём.

— Давай я дапамагу табе ўстаць, га? Ты-ж зьмерзьнеш, лежачы ў сьнезе.

Васіль маўчаў, толькі чутно было, як ён хрыпла дыхаў і кашляў у сьнег.

Даша паспрабавала падняць яго й пасадзіць на пляцень, але хлапец зусім ня ймкнуўся ўважыць ёй, нібы наўмысьля, шыўся глыбей у сьнег.

— Бок у мяне вельмі баліць, — як сабачаня, заскуголіў ён, — і няма мне чаго падымацца, няма куды йсьці... Напаілі, дурня, падвялі... Ідзі, кажуць, выведзі бычка ў Андрэіхі, пакуль яна зноў не забрала яго ў сенцы. Заўтра будзе міравая закуска... Ніхто ня ўгледзіць, — добра, а калі ўгледзіць, то скажы, што забіраеш на нарыхтоўку па асабістаму распараджэньню старшыні сельсавету. Я хацеў ня йсьці, ды што-ж... Мокрут так зыркнуў на мяне, што аж у лытках стала холадна. Млынар сунуў мне ў рукі вось гэтую самую шапку й кажух, а Заткла вывеў на вуліцу.

— Не прасі мяне ўставаць, Даша, — трошкі падняўшы галаву, жаласьліва гаварыў далей хлопец. — Усёроўна мне ўжо ня ўстаць. Калі не капурну пасьля гэтага, то сам на сябе рукі налажу. Паслухай лепш, што я хачу ў цябе папрасіць. Ня пішы ты аб гэтым Валодзю, брату майму. Не даруе ён мне гэтага ніколі, а толькі хваляваць будзе. Лётчыку-ж, сама ведаеш, нельга хваляваць.

— Добра, Вася, — ціха сказала дзяўчына. — Пра гэта я ня буду пісаць, калі ты так просіш. Але дараваць табе запраўды нельга.

X

Назаўтра Іванава бабулька пачала шкрабацецца вельмі рана, і пакуль Іван устаў, адзеўся, яна ўжо некуды зьбегала прыцемкам, нешта навет прынесла пад палою. Зірнуўшы мімаходам на кватаранта, скрыпуча закашлялася ад удушлівага сьмеху й паведаміла аб начным здарэньні ў Дабрасельцах.

— Злодзея злавілі, ды яшчэ якога!

Пасьля гэтага прычапала да свайго вялізнага куфра, на вачох у Івана двойчы дзынкнула нутраным замком і, адвярнуўшыся, паклала ключ у нейкую там патайную кішэню.

Была ў гэты дзень нядзеля, у сельсавеце тэрміновай работы ня было, дык Іван надзеў сваё паношанае палітцо, узяў у качарэжніку кіёк і пакрочыў памаленьку ў бок сваіх Дабрасельцаў. Мароз адлёг пад раніцу, і вецер уціх, дзень пачынаўся такі, што й вясна магла-б яму пазайздросьціць. Сьнег мяккі, ня ліпкі яшчэ, аднак і ня сыпучы. Здаецца, вазьмі яго ў руку — і не адчуеш холаду. Пад нагамі ня коўзка й ня вязьне нага, як іншы раз пасьля замеці.

«Схаджу дахаты, — думаў Іван, — спытаю там, што за здарэньне выйшла і ў сваім двары пабуду».

Калі ўжо міналася школа й пачынаўся паваротак да бяскрылых млыноў, Іван раптам пачуў, што яго нехта заве. Ён аглянуўся і ўбачыў, што па вуліцы йдзе Ільля Савіч і знакам рукі просіць пачакаць. Іван спыніўся й прыставіў да карацейшай нагі кіёк.

— Куды вы так рана? спытаў дырэктар, падаўшы Івану руку.

— Хацеў у Дабрасельцы, — трошкі зьдзівіўшыся, што яго нагналі, адказаў хлапец. — А што, тут ёсьць якая справа?

— Ды не, — прыязна сказаў Ільля Савіч. — Мне самому ў той бок, дык пойдзем разам.

Яны рушылі ўдвух па нікім яшчэ ня кранутай дарозе. Іван стараўся прыбаўляць крок, каб ня вельмі стрымліваць вышэйшага ростам і бойкага ў хадзе дырэктара, а дырэктар зусім няпрыкметна, нібы толькі для таго, каб зручней было размаўляць, прыцішаў хаду.

— Хачу застаць эмтээсаўскае начальства, — гаварыў, ідучы, Ільля Савіч. — Можа яшчэ ня выскачыла з дому, паколькі сяньня выхадны.

— Хто яго ведае, — няпэўна сказаў Іван. — Вельмі-ж любіць зайцоў ганяць, то наўрад ці дома.

— Так яно, — згадзіўся Ільля Савіч. — То за зайцам паімчалі, то за ваўком, а на месцы не застанеш. Абяцалі сьвятло даць у школу, дык ужо каторы раз іду. Аднойчы, праўда, застаў быў дырэктара, але сакратарка ледзь пусьціла ў кабінэт. Электрычны званок у яе над галавою. У мяне ў школе сьвятла няма, зімою вучні й настаўнікі сьлепяцца й вэндзяцца пры лямпах, а побач у дырэктара МТС электрычныя кнопкі на стале.

— Ня быў я ў яго кабінэце, — заўважыў на гэта Іван, — аднак чуў, што ў яго там больш мэханізацыі, як у рамонтнай майстэрні. Кнопкі, званкі, вэнтылятары. Наш старшыня неяк пра гэта расказваў.

— Мокруту ўсё гэта па густу, — заўважыў Ільля Савіч.

— Аднаго разу сеў у папоўскае крэсла, — гаварыў далей Іван, — паклаў рукі на стол і загадаў Печку сабраць нас усіх да сябе. Прыйшлі мы, а ён сядзіць, адкінуўшыся на сьпінку крэсла, і абмацвае рукамі стол. «Запомніце кажны, — гаворыць нам, але не глядзіць на нікога, — больш я ня буду драць горла, завучы вас, а будзе ў мяне для кажнага званок: для цябе Печка, — адзін, для цябе, — паказвае на мяне, — два, для цябе, — паказвае на фінагента, — тры й так далей. Дагаварыўся з дырэктарам МТС — дае мне электраэнэргію».

— Ды званкоў то ён нарабіў-бы, — бязь зьдзіўленьня сказаў Ільля Савіч. — Была-б магчымасьць, дык і сакратарку пасадзіў-бы за дзьвярыма.

— Прыйшлі-б вы калі-небудзь да нас на прыймо, — сьціпла ўсьміхнуўшыся, сказаў Іван. — Толькі каб пад якім грымам і ў чужой вопратцы.

— Уяўляю я гэтае прыймо, — падхапіў дырэктар. — Неяк прыходзіла ў школу Даша, новыя рэкамэндацыі прыносіла. Яна расказвала мне пра адно такое прыймо. Дарэчы, трэба было-б ужо й вам пачынаць думаць наконт паступленьня ў партыю, у кандыдаты, вядома.

— А можна мне, Ільля Савіч, вось навет цяпер падаць заяву? Як вы лічыце?

— Цяпер яшчэ ранавата, — зь цяплынёй у голасе, аднак цьвёрда сказаў дырэктар. — Вам трэба стаць больш актыўным, навучыцца ненавідзець усякія недахопы ў нашым жыцьці. Зь недахопамі трэба змагацца штодзённа й вельмі настойліва.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

«Перавагі» сацыялістычнай сельскай гаспадаркі

У газэце «Сельское хозяйство» з 26-га верасьня г. г. на дзьвёх газэтных бачынах зьмешчаны розныя статыстычныя дадзеныя аб становішчы сельскай гаспадаркі. Усё гэта загалоўлена — «Аб наважаных перавагах буйнай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі». Ужо сам назоў паказвае, што сумлеўныя посьпехі сельскай гаспадаркі СССР непарыўна зьвязаны з буйнымі калгасамі й саўгасамі. Дзеля большай пераканаўчасьці ўдачаў газэта паклікаецца на наступныя лікі. Паводля падлікаў агульная прадукцыя сельскай гаспадаркі СССР за 1954-6957 гады збольшылася на 7,1 працэнтаў, а ў ЗША — толькі на 1,1. Каб больш зафіксаваць гэтыя працэнты ў памяці чытачоў, у газэце зьмешчана навет адпаведная дыяграма, на якой сярод буйных каласоў пшаніцы — СССР і лічба 7,1, а на другім маленькім слупіку сярод дробных каласкоў адзначана толькі 1,1, а наверсе — вялікія літары ЗША. Аднак да гэтай дыяграмы ў тэксьце ня зьмешчаныя ніякія тлумачэньні. Між тым, сельская гаспадарка ЗША дасягнула такога становішча, што яна поўнасьцяй забясьпечвае патрэбы 170,2 мільёнаў жыхарства ЗША, мае вялізарныя запасы збожжа, масла, кансэрваванага мяса, малака, яек ды аказвае краінам, у якіх здараюцца стыхійныя няшчасьці, дармовую дапамогу прадуктамі.

Такія дыяграмы зьмяшчаюцца з мэтай абмануць працоўныя масы Савецкага Саюзу, што нібы тэмпы росту сельскай гаспадаркі стварылі такія ўмовы, што СССР у бліжэйшым часе можа дагнаць і перагнаць ЗША ў вытворчасьці асноўных прадуктаў жывёлагадоўлі на душу жыхарства.

А між тым вытворчасьць мяса й сала ў ЗША на душу жыхарства складае 97 кг., а ў Савецкім Саюзе — толькі 36 кг. Крыху лепш, хоць яшчэ далёка да таго, каб перагнаць ЗША, стаіць справа з прадукцыяй малака, якога ў ЗША на душу жыхарства прадукуецца 335 кг., а ў СССР — 268 кг. Калі навет прыняць на веру, што запраўды ў СССР вытворчасьць мяса й малака на душу жыхарства такая, як падаюць яе савецкія крыніцы, ды прыдзецца яшчэ шмат гадоў даганяць ЗША. Дарэчы тут адцеміць, што вольны сьвет ня зьбіраецца спаборнічаць із Савецкім Саюзам з тае простае прычыны, што няма ніякае патрэбы прыймаць нейкія адмысловыя крокі для пашырэньня свае вытворчасьці сельскагаспадарчых прадуктаў. Тут няма ніякай патрэбы стаяць у чарзе, каб атрымаць тыя ці іншыя прадукты.

Дык у чым-жа тады перавагі «буйнай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі? Амаль трыццаць гадоў існуюць ужо калгасы, а саўгасы й яшчэ больш. А тымчасам камуністычная прапаганда няспынна й сяньня цьвердзіць, што **барацьба за хлеб** — справа ўсяго савецкага народу. Пра задаваленьне-ж працоўных масаў мясамалочнымі прадуктамі й гаварыць ня прыходзіцца. З гледзішча на дарагавізну навет і пры наяўнасьці ў прадажы мяса, масла й малака да іх звычайнаму работніку даступіцца цяжка. І тым ня менш гэтых дарагіх прадуктаў няма ў дастатковай колькасьці ў дзяржаўных і каапэрацыйных магазынах.

ЦК КП Беларусі й Савет міністраў БССР у сваіх пастановах вельмі часта павучаюць калгасы і саўгасы як дасягнуць высокіх ураджаяў розных сельскагаспадарчых культураў, высокіх надояў малака, станоўчых вынікаў адкорму жывёлы й г. д. Так, прыкладам, 24 верасьня г. г. у газэце «Советская Белоруссия» зьмешчана пастанова ЦК КП Беларусі й Савету міністраў БССР «Аб мерах для павялічэньня вытворчасьці ялавічнага мяса ў калгасах і саўгасах рэспублікі ў 1959 годзе». У пастанове адзначана, што «ў выніку дрэннай арганізацыі адкорму й нагулу буйнай рагатай жывёлы шматлікія калгасы й саўгасы рэспублікі штогод рэалізуюць на мяса вялікую колькасьць нізкаважкіх, няўкормленых жывёл і тым самым рэзка зьніжаюць якасьць мяса й дапускаюць вялікае перавыдаткаваньне пагалоўя жывёлы».

Наколькі дрэнна зарганізавана здаваньне дзяржаве жывёлы на мяса сьветчаць наступныя факты. Калгас «Перадавік» Чавускага раёну, Магілёўскай вобласьці, здаў на мяса ў гэтым годзе 115 галоў буйнай рагатай жывёлы сярэдняй жывой вагой 93 кг., зь іх 95 былі зусім худымі. Суседні калгас «Шлях да камунізму» здаў 179 галоў; сярэдняя жывая вага аднае галавы дасягнула толькі 80 кг., 162 жывёліны былі худымі. Каб пакрыць ськідку, якая робіцца нарыхтоўчымі арганізацыямі ў тых выпадках, калі калгасы здаюць дзяржаве худую жывёлу, калгасы Берасьцейскай вобласьці былі змушаны здаць звыш нормы 4 тысячы тон ялавічнага мяса, Менскай вобласьці — 3, Маладэчанскай — 2,5 і Віцебскай — 2 тысячы тон.

Як заўсёды, так і ў гэтым выпадку, камуністычнае кіраўніцтва, каб зьняць зь сябе адказнасьць і адвесьці незадаваленьне працоўных масаў за недастатковую колькасьць мясных прадуктаў у прадажы, звальвае віну на калгасы, якія здаюць на мяса худых цялят. А між тым, амаль што пяць дзён у газэтах зьмяшчаюцца дадзеныя аб ходзе нарыхтовак мяса й малака. Калгасы прымушаюцца здаваць жывёлу датэрмінова. Кіраўнікі раёнаў і вобласьцяў, датэрмінова выканаўшых пляны здаваньня прадукцыі сельскае гаспадаркі адзначаюцца як высокасьведамыя патрыёты. Дык пры такой сьпешнасьці няма ніякай магчымасьці давесьці жывёлу да поўнай вагі і ўкормленасьці.

У сувязі з тым, што кіраўніцтва страціла ўжо надзею на тое, каб калгаснасаўгасная жывёлагадоўля забясьпечыла жыхарства мяса-малочнымі прадуктамі, на прапанову пленуму ЦК КП Беларусі калгасы й саўгасы закантрактавалі ў калгасьнікаў, работнікаў і служачых 500 тысяч цялят. Закантрактавалі, але не сьпяшаюцца забіраць іх ад собсьнікаў, бо ў калгасах няма чым карміць. Нарэшце каб пазбавіцца ад лішняй жывёлы, закупленых цялят калгасы й саўгасы накіроўваюць на мясакамбінаты.

Таму нічым іншым як самахвальствам называецца ўся гэта шуміха аб магчымасьцях ня толькі дагнаць, а і перагнаць ЗША ў вытворчасьці мясамалочных прадуктаў у бліжэйшыя гады.

В. Б.

Спадкаемнікі чарнасоценскай рэакцыі

(Заканчэньне з 2-ой бачыны)

ягонымі прадстаўнікамі магла-б быць пачаткам канца камунізму». Як ня гучыць гэта парадаксальна, але прыведзеных толькі што словаў рэзалюцыі ніяк інакш разумець немагчыма, як толькі так, што Хрушчоў або ягоныя прадстаўнікі, будучы да глыбіні ўзварушаныя прыязьняй Амэрыкі да расейскага народу й ейнай гатоўнасьцяй абараняць «единую и неделимую», самі зробяць «пачатак канца камунізму».

Такім чынам, рэзалюцыя абсалютна не даводзіць і нікога ня пераконвае, што ў часе збройнага канфлікту расейскі народ будзе падтрымліваць савецкі ўрад у выпадку, калі Амэрыка ўзапраўды стане пад лёзунгам вольнасьці й дзяржаўнай незалежнасьці ўсіх народаў, паняволеных бальшавізмам. Затое палітычная вымова рэзалюцыі ў дастатковай меры ставіць Амэрыку перад нявыключанай эвэнтуальнасьцяй, што аўтары рэзалюцыі й наагул тыя, што яе прынялі, могуць, як многія іншыя «патрыёты» із старой і новай расейскай эміграцыі ўжо зрабілі, стаць на баку Хрушчова або ягоных наступнікаў навет незалежна ад таго, будзе амэрыканская палітыка «расчленительной» ці ёю ня будзе. У гэтым нядвузначным самаздэмаскаваньні расейскай нацыяналістычнай рэакцыі й заключаецца адзіная пазытыўная вартасьць для Захаду ад ньюёрскай рэзалюцыі.

Алесь Крыга

Група ўдзельнікаў конкурсу беларускае нацыянальнае вопраткі на вечарыне ў Нью Ёрку, ладжанай з нагоды Трэйцяе Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ды VII гадовага зьезд у ЗБМА 30 жніўня 1958 г.

Фота: Я. Пазьняк

Матар'ялы пра Якуба Коласа

У верасьнёвым нумары менскага часапісу «Беларусь» зьмешчаны некаторыя матар'ялы пра Якуба Коласа, якія захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Летувіскай СССР. Гэтыя матар'ялы датычаць выпуску сэмінарыстых Нясьвіскай настаўніцкай сэмінарыі ў 1902 годзе, калі й наш паэта Якуб Колас закончыў гэтую навучальную ўстанову.

Сярод названых архіўных матар'ялаў, — піша «Беларусь», — ёсьць копія пратаколу паседжаньня пэдагагічнай рады Нясьвіскай настаўніцкай сэмінарыі, які абмяркоўваў вынікі пераводных і выпускных экзаменаў, што адбываліся ад 2-га траўня да 13-га чэрвеня 1902 году. Пэдагагічная рада пастанавіла даць настаўніцкі дыплём дваццаць аднаму выхаванку сэмінарыі, у тым ліку й К. Міцкевічу, які значыўся трэйцім на сьпісе; сьпіс-жа складаўся ў вадпаведнасьці з пасьпяховасьцяй выхаванцаў.

У тым-жа архіве захоўваецца папка № 2870 пад загалоўкам «Аб назначэньні выхаванцаў настаўніцкіх сэмінарый, перададзеных у распараджэньне дырэкцый народных вучылішчаў на настаўніцкія пасады». У гэтай папцы ёсьць копія пратаколу паседжаньня школьнай рады Менскай дырэкцыі народных школ з 28-га жніўня 1902 году, які разглядаў пытаньне аб назначэньні выпускнікоў Нясьвіскай настаўніцкай сэмінарыі на вакантныя пасады ў пачатковых школах.

«Маючы на ўвазе характарыстыкі выхаванцаў Нясьвіскай настаўніцкай сэмінарыі, — гаворыцца ў гэтым пратаколе, — закончыўшых у гэтым годзе курс, адпраўленыя ў дырэкцыю Дырэктарам сэмінарыі, і бяручы на ўвагу й матар'яльныя ўмовы службы ў тых вучылішчах, у якіх ёсьць вольныя ваканцыі, Школьная Рада Дырэкцыі пастанавіла: з закончыўшых у гэтым годзе курс выхаванцаў Нясьвіскай настаўніцкай сэмінарыі назначыць зь 1-га кастрычніка... Міцкевіча Канстанціна ў Охаўскае народнае вучылішча, Пінскага павету».

ХОЧАШ ЗРАБІЦЬ СВАЙМУ БЛІЗКАМУ ПРЫЕМНАСЬЦЬ І АДНАЧАСНА КАРЫСЬЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ СПРАВЫ, ПАДАРУЙ ЯМУ КАМПЛЕКТ КНІЖАК ВЫДАВЕЦТВА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»

У гэтай-жа папцы ёсьць і «Ведамасьць аб выхаванцах, закончыўшых у 1902 годзе курс Нясьвіскай настаўніцкай сэмінарыі й прызначаных на пасаду настаўнікаў у народныя вучылішчы Менскай губэрні». У ведамасьці значыцца й Міцкевіч Канстанцін; у графе пад назовам: «Маральныя й матар'яльныя ўмовы, у якіх вучылішча знаходзіцца», — чытаем: «Жалаваньня настаўніку 200 р. (у год); пры вучылішчы дзесяціна зямлі. Вучэбная справа патрабуе палепшаньня». У графе «На якой падставе і ў сілу якіх меркаваньняў пэўная асоба прызначаецца на тое ці іншае настаўніцкае месца» чытаем наступнае: «Охаўскае вучылішча знаходзіцца ў мясцовасьці, жыхарства якой ня ўсьведамляе цалкам карысьці й неабходнасьці пісьменнасьці, а таму вельмі неахвотна пасылае дзяцей сваіх у школу. Апошняя акалічнасьць служыць галоўнай перашкодай да пажаданай пастаноўкі вучэбнай справы ў вучылішчы. Для ліквідацыі гэтага неабходна асабістае ўзьдзеяньне на сялян настаўніка. Такім настаўнікам абяцае быць Міцкевіч, які, паводля Пэдагагічнай Рады сэмінарыі, чалавек вельмі паважны, сталы, ведае добра мясцовую прыроду й сялянскі быт, любіць сялянства й навет вывучае яго».

Новыя архіўныя матар'ялы аб Я. Коласе ўзбагачаюць веды аб клясыку беларускай літаратуры.

У гаворцы не заўважылі, як мінулі бяскрылыя млыны, як на фоне сіняватага ранішняга далягляду пачалі вырысоўвацца Дабрасельскія прысады.

— Тут быццам-бы нейкі перапалох быў ноччу? — зусім ня думаючы, што гэта мае якое-небудзь значэньне, прамовіў дырэктар.

— І я чуў, — пацьвердзіў Іван. — Мая бабуля на досьвітку ўсё зьдзіўлялася.

— Гэтая бабка ўсё ведае, — засьмяяўся дырэктар, — хоць, здаецца, нікуды й ня ходзіць.

Магчыма, што аб гэтым выпадку ня было-б больш і гаворкі, калі-б на Дабрасельскай вуліцы раптам ня сустрэўся Заткла. Ён выйшаў із свайго двору, ня вымаючы з портак рук (варотаў у двары няма, адчыняць ня трэба), пацягнуўся, пазяхнуў і пачаў углядацца спачатку ў вадзін бок вуліцы, потым у другі. Відаць у гэты момант вырашалася ў чалавека задача, куды-б гэта пайсьці, які ўзяць кірунак, каб апахмяліцца ды ўхапіць што-небудзь, бо ў сваёй хаце нічога няма.

Убачыўшы здалёк двух мужчын, ён адразу павесялеў і рушыў ім насустрач, хоць яшчэ ня ведаў, хто гэта йдзе. Як толькі наблізіўся й пазнаў сустрэтых, на момант засмуціўся, — з гэтымі ня клюнеш, — аднак вельмі хутка знайшоў сваю ролю. Ягоны немалады й трохі жаўтаваты ад выпівак, аднак ледзь не спартсмэнскі твар адразу разьехаўся ў шырокую панібрацкую ўсьмешку, рукі спачатку жвава заварушыліся ў портках, а потым выехалі адтуль і прыветна падняліся на ўзровень носа.

— Маю гонар, маю гонар! — урачыста загаласіў чалавек, сапхнуўшы з вачэй вялізную заечую шапку. — Я самы першы вітаю вас на нашай вуліцы!

Заткла з размаху падаў руку спачатку дырэктару, а потым Івану, прыпыніў іх гэтым сваім здароўканьнем і, адразу перамяніўшы тон, спытаў:

— Чулі, таварышы?

— Пра што? — абыякава спытаў дырэктар.

— Гэта-ж толькі падумаць, толькі падумаць!..

Заткла палапаў па кішэнях свае ватоўкі, навет пашарыў у вадной, але выцягнуў адтуль толькі шматок бруднай ваты.

— Закурыць ня маеце?

Ільля Савіч дастаў пачак папярос.

— Гэта-ж проста... А браткі мае! — працягваў абурацца Заткла і ў гэты час, не сьпяшаючыся, выцягваў з пачкі папяросы: спачатку адну, а потым яшчэ дзьве. — Часта ў нас балбочуць, трэплюць языкамі: той вінаваты, той. Было навет — я чалавек адкрыты — было навет, што на мяне ківалі. Ажно-ж бачыце, адкуль рыба пачынае гнісьці? Гэта-з проста ўзяць ды ў газэту, ці, я ўжо ня ведаю, куды.

— Аб чым-жа вы гэта? — ужо губляючы цярпеньне, папытаў Ільля Савіч.

— Аб чым, аб чым? — папрокам перапытаў Заткла. — Вы яшчэ пытаеце, аб чым? А ведаеце, хто сяньняшняй ноччу ўкраў у Андрэіхі бычка? Ня ведаеце? Скажу, калі ласка...

Хоць і цяжка было паверыць гэтаму чалавеку, хоць цяжка было-б узяць гэта на веру ад усякага іншага, усё-ж такое паведамленьне вельмі ўразіла й дырэктара, і Івана. Яны йшлі далей моўчкі, таму што Заткла, які не адставаў ад іх, перашкаджаў ім гаварыць, але ў думках кажны зьдзіўляўся й ня мог уявіць, як гэта Васіль Печка пайшоў на такі ўчынак. Ільля Савіч зьдзіўляўся больш за Івана. Ён памятаў Васіля яшчэ із школы, нічога дрэннага ніколі за хлопцам не заўважалася. Хіба ўжо цяпер так яго папсавалі?

Іван больш выразна бачыў Васілёвыя слабінкі, бо ня малы час працаваў разам зь ім, аднак і ён адчуваў, што ў гэтым здарэньні ёсьць нешта вельмі незразумелае.

Калі ля свайго двара Іван прыпыніўся, Ільля Савіч папрасіў яго даведацца, як усё гэта выйшла. Сам на сябе ён не спадзяваўся, таму што мог затрымацца ў МТС.

— Будзеце йсьці назад, — сказаў ён на разьвітаньне, — заглянеце да мяне.

Заткла таксама быў пусьціўся за дырэктарам, а потым, відаць, перадумаў: спыніўся ля свайго двара, засунуў рукі глыбока ў порткі й пачаў смачна, з выгібам сьпіны пазяхаць. Неўзабаве ён насунуў на вочы абвіслую вушанку й рушыў да двара Кадрыліхі.

Вароты ў Іванаў двор былі шчыльна зачынены, драцяны абадок нацягнуты на стаўпец. Сьнег як прысыпаў ноччу ўвесь гэты сэдасік, так ён прысыпаным і заставаўся: нідзе ні сьледу, ні якога-небудзь парушэньня зімняй сьвежасьці. Навет на клямцы дзьвярэй ляжаў нікім ня кранутый пласток сьнегу. Іван абапёрся локцямі на верхнюю жардзіну варот. Жардзіна скрыпнула й трошкі ўгнулася, зь яе апалі лёгкія камкі сьнегу. Не хацелася пакуль-што заходзіць у двор, і цяжка сказаць чаму. Пракладзеш адзін-адзіны сьлед, і потым ён будзе тырчаць на ўсю вуліцу. Зоймешся, зразумела, сякой-такой работай і не пасьпееш сустрэцца зь людзьмі, празнаць, што там здарылася з Васілём. А можа проста сумна было заставацца аднаму.

Страсянуўшы вароты так, каб і зь ніжніх жардзінак апаў сьнег, Іван да часу пакінуў свой двор. Андрэіха ўжо вярталася з фэрмы, калі ён падыходзіў да гародчыку, што перад яе хатай.

— Зайдзі, Іванка, да нас, — папрасіла гаспадыня.

Аднак не пасьпелі яны перакінуцца й двума словамі, як у хату ўвайшлі Мокрут і Ціхоня. Убачыўшы тут Івана, Мокрут спачатку злосна глянуў на яго, а потым размашыста прайшоўся па хаце, надзьмуў вальлячок і зьвярнуўся да гаспадыні.

— Самагонку гоніш?

Андрэіха паглядзела на старшыню спачатку зьдзіўлена, а потым яе бледныя, прыморшчаныя вусны крануліся ўсьмешкай. У жанчыны мільгнула надзея, што сусед жартуе.

— Хіба я калі гнала? — бяз трывогі папытала яна. — Я ніколі ня гнала.

— У мяне ёсьць матар'ял! — грозна сказаў Мокрут. — Так што, давай ня гэта самае!.. Па чыстай совесьці кажу!

Жанчына адразу зьмянілася ў твары, бо яна ўжо трохі ведала, што такое «матар'ял» на чалавека.

— Ня гнала я самагонкі, — з крыўдай і роспачай у голасе сказла Андрэіха. — Няма ў мяне з чаго гнаць і няма чым. Вы ня туды прыйшлі, калі вам трэба самагонка.

— А куды нам ісьці, куды? — Губы старшыні злосна сьціснуліся.

— Вы самі ведаеце, хто гоніць самагонку.

— А хто, ну хто? — Мокрут ступіў да Андрэіхі з такім выглядам, быццам хацеў прыгнясьці яе, маленькую й бездапаможную, сваім калючым зрокам, галавою ў хромавай шапцы, шырокімі, крыху сутулаватымі плячамі. — А хто? Скажы!

«Ваша радня», — хацела сказаць Андрэіха, ды не асьмелілася, адвяла вочы, і яе зрок міжвольна ўпаў на вакно, якое выходзіць у бок Мітрафанавага двара.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Зь мінулага нашай Бацькаўшчыны

Старажытны Менск

Менск — вельмі старажытны горад. На бачынках летапісу ён успамінаецца пад 1067 годам, гэта значыць, на 80 гадоў раней, чымся зьявілася першае паведамленьне аб Маскве.

Зь летапісу мы ведаем, што ў XII стагодзьдзі Менск (у старабеларускай мове — Менеск) становіцца цэнтрам удзельнага княства, і яго палітычнае значэньне вельмі ўзрастае. Але які выгляд меў сам горад, якую тэрыторыю ён займаў, які быў колькасны й сацыяльны склад жыхарства, чым яно займалася й г. д. — аб гэтым летапіс нам нічога не паведамляе. Праўда, вядома, што ў 1067 годзе, у часе вайны паміж кіеўскім і полацкім князямі мянчане схаваліся за гарадзкімі варотамі. Гэта значыць, што горад, або нейкая яго частка была абнесена крэпасной сьцяной. І гэта амаль усё, што мы ведаем аб вонкавым выглядзе старажытнага Менску зь пісьмовых дадзеных. Як бачым, гэтага вельмі мала. Больш таго, першае летапіснае ўспамінаньне аб Менску выклікала паміж вучонымі спрэчкі адносна самога месцазнаходжаньня гораду. Археалёгі паклалі канец гэтай спрэчцы.

У 1945 годзе на тэрыторыі гэтак званага менскага Замчышча, якое знаходзіцца ля ракі Сьвіслач, у раёне плошчы 8 Сакавіка, раскопкамі былі выяўлены магутныя напластаваньні, адкладзеныя за час жыцьця гораду. З таго часу на працягу некалькіх гадоў Інстытут гісторыі Акадэміі Навук БССР вядзе раскопкі старажытнага Менску. Цяпер ужо ўскрыта значная плошча, а ў мінулым годзе былі выяўлены сьляды таго валу, за якім схаваліся мянчане ў 1067 годзе. Стары Менск складаўся зь дзьвёх частак — умацаванай (крамля, або дзяцінца) і няўмацаванай (пасаду). На Замчышчы разьмяшчаўся гарадзкі крэмль, абнесены зямельным валам. Цікава, што ў назовах менскіх вуліц захаваліся ўспаміны аб існаваўшых тут некалі ўмацаваньнях. Так, цяперашняя Замкавая вуліца праходзіць з захаду на ўсход праз увесь крэмль. Яна, як відаць, была галоўнай магістраляй. Вуліца Падзамкавая абводзіць умацаваную частку гораду з поўначы й захаду. Разьмешчаная паралельна да Нова-Мясьніцкай, Завальная ўжо сваім назовам сьветчыць аб тым, што тут праходзіла паўднёвая мяжа ўмацаваньняў. Гэтыя назіраньні, а таксама дайшоўшыя да нас пляны Менску XVIII ст., на якіх прыкметна бачны сьляды старажытнага валу, даюць магчымасьць абвесьці тэрыторыю менскага крамля. Яна працягвалася на 250—270 мэтраў на захад ад ракі Сьвіслач і мела каля 130 мэтраў з поўначы на поўдзень.

Павышаная вільготнасьць грунту садзейнічае доўгай захаванасьці арганічных матэрый. У гэтым сэньсе Менск становіць сабой вельмі каштоўны й цікавы археалягічны помнік. Раскопкі выяўляюць добра захаваныя рэшткі драўляных дамоў і вулічных маставых. Нягледзячы на тое, што ў зямлі знаходзяцца толькі ніжнія часткі будынкаў, магчыма адшавіць іх былы вонкавы выгляд, Гэтаму дапамагаюць як знаходкі асобных дэталяў будынкаў, так і параўнальныя этнаграфічныя дадзеныя. Вызначана, што старажытны Менск меў некалькі вуліцаў. Як і ў іншых тагачасных гарадох Беларусі й Заходняй Эўропы, яны былі вузкімі й цесна забудаванымі хатамі й рознымі будынкамі гаспадарчага значаньня. Самыя вялікія з выяўленых вуліц былі ледзь шырэй за 3 мэтры.

На ўсёй сваёй плошчы вуліцы засьцілаліся драўляным насьцілам. У меру таго, як маставая прыходзіла ў няпрыгоднасьць, зьверх яе насьцілалі новую. Устаноўлена, што за пэрыяд XII-XIV стагодзьдзяў вуліцы перасьцілаліся ня менш за 7 разоў. Цікава адзначыць, што ў такіх краінах Заходняй Эўропы, як Ангельшчына й Нямеччына, вуліцы ў гарадох сталі масьціцца значна пазьней.

Раскопкі ў Менску яшчэ раз сьветчаць аб тым, што старабеларускія цесьляры дасягнулі ў сваёй справе вялікага майстэрства й вынаходлівасьці. Выяўленыя шматлікія драўляныя пабудовы (хаты, канюшні, сьвіраны, хлявы, маставыя й г. д.) рабіліся без адзінага цьвіка, хаця каваныя цьвікі, гэтак званыя «кастылі», былі тады вядомы й пры раскопках зьяўляюцца даволі частай знаходкай. Старажытныя цесьляры дасканала валодалі сякерай. Усе будынкі зроблены бяз ужываньня пілы. Навет дошкі, якімі засьцілаліся маставыя й падлогі хат, рабіліся сякерай і цяслом. Зразумела, пілу ведалі, але-ж яна выкарыстоўвалася, галоўным чынам, у косткарэзнай і ювэлірнай справе.

За ўсе гады раскопак у Менску выяўлена каля трох дзесяткаў зрубаў, якія адносяцца да XI-XV стагодзьдзяў. За гэты час тэхніка будоўлі зьмянілася мала. Асноўнай жыльлёвай будоўляй была казённая зрубная хата, якая мела звычайна адзін пакой, памерам ня звыш 20-25 кв. м. Унутры хаты ў вадным з куткоў разьмяшчалася глінабітная печ, пабудаваная на нізкай драўлянай «плятформе». Такія печы ня мелі дымаходаў і комінаў і паліліся «пачорнаму». З нутранога абсталяваньня пакояў выявіць пакуль нічога не ўдалося. Трэба думаць, яно было вельмі скромным.

Да жальлёвай хаты шчыльна прылягалі гаспадарчыя будоўлі, што ўсё разам складала адзіную сядзібу, адгароджаную ад іншых парканам. Частку такой сядзібы з варотамі, што выходзяць на вуліцу, удалося выявіць у 1957 годзе.

Занадта вялікая скучанасьць будынкаў стане зразумелай, калі прыгадаць, што гэтая частка гораду была абмежавана ў сваёй плошчы абароннымі ўмацаваньнямі.

Цікавым зьяўляецца вызначаны раскопкамі факт вылучнай устойлівасьці ў часе ўнутрыгарадзкога пляніраваньня. З XI да XV ст. кірунак менскіх вуліц не мяняўся. Больш таго, збудаваныя замест старых новыя будынкі ставіліся на месцы ранейшых, вельмі часта іх урубалі ў захаваныя вянцы старых. Так, у 1957 годзе на адным месцы былі выяўлены рэшткі 5 розначасовых будынкаў.

Дасьледваньні Менску працягваюцца. Перад вучонымі стаіць яшчэ шмат неразьвязаных пытаньняў. Раскапаны ўчастак складае вельмі нязначную частку гарадзкой тэрыторыі. Яшчэ чакае свайго вывучэньня рамесны пасад, аб якім мы пакуль што нічога ня ведаем. Якраз там было сканцэнтравана гандлёвае й рамесьніцкае жыхарства гораду, і тут працякала асноўнае гаспадарчае жыцьцё. Раскопкі пасаду дадуць найцікавейшы матар'ял аб рамястве й гандлі жыхароў старажытнага Менску.

Э. Загарульскі

(«Маладосьць», 1958, № 9)

10 год таму «Бацькаўшчына» пісала:

... Гісторыя вучыць нязьбіта, што надзеі на «добрых» суседзяў, гэта надзеі на няволю, і што адзінай гарантыяй нашых дасягненьняў, як народу, ёсьць нашая собская арганізаванасьць, салідарнасьць і сіла нашага патрыятызму. Трывалыя назыгыўныя вынікі дасца асягнуць толькі адпаведнай сацыяльнай палітыкай, якая разумеецца, будзе ў цеснай залежнасьці ад сацыяльнай структуры народу.

№ 31 (34), 10 кастрычніка 1948 г.

Праблемы Беларускага таварыства ў Польшчы

25—26 кастрычніка сёлета ў Беластоку мае адбыцца Пленум Галоўнага Праўленьня Беларускага Грамадзка-Культурнага Таварыства. У сувязі з гэтым апошнімі часамі ўжо ў некалькіх нумарох «Нівы» былі зьмешчаны артыкулы, у якіх разглядаюцца й абмяркоўваюцца шматлікія пытаньні й прапановы што да палепшаньня працы Таварыства.

З дагэтуль зьмешчаных артыкулаў выглядае, што культурна-грамадзкая праца Таварыства яшчэ далёка да задавальняючай, яна не дасягае таго ўзроўню, на які дазваляюць навет аб'ектыўныя абставіны. Пасьля Другога зьезду БГ-КТ у «Ніве» чуліся аптымістычныя галасы, што цяпер праца нарэшце наладзіцца й будзе мець патрэбны размах і насычанасьць. Тымчасам выглядае, што на практыцы гэта не апраўдалася.

Нам цяжка на адлегласьць меркаваць ці разглядаць розныя бакі дзейнасьці Таварыства, таму мы гуг і ня можам даць нейкага абагульненьня ці вывадаў, а толькі паінфармаваць аб тым, што на гэтую тэму пішацца ў «Ніве».

Так, прыкладам, старшыня Г. П. Таварыства, Ул. Станкевіч, у сваім артыкуле «Урэальніць і актывізаваць дзейнасьць БГ-КТ» («Ніва» № 38 (134), разглядаючы мэтады працы, піша:

«Трэба, каб нашы паседжаньні перасталі ўжо быць гаварыльнямі, на якіх толькі абмяркоўваюцца справы, аналізуюцца недахопы, шукаюцца іх прычыны й вінаватыя таму, што нічога ці мала зроблена». Ягоная прапанова: менш тэарэтычных разважаньняў, а больш практычнай канкрэтнай працы. Аднэй зь перашкодаў у працы, паводля Ул. Станкевіча, — гэта ўсё яшчэ той самы камплекс ніжэйшасьці нашых масаў, які паўстаў у выніку доўгага нацыянальнага паняволеньня. Нярэдка адчуваюцца таксама перашкоды з боку варожа настаўленых да Беларусаў шавіністычных польскіх элемэнтаў.

Р. Лясун у дыскусійным артыкуле «Ці не ў мадэлі справа?» («Ніва», № 37 (133) адзначыўшы, што «ад самага пачатку нашага арганізацыйнага йснаваньня ўсё паляпшаем нашу працу, а вынікі мізэрныя», дапушчае, што віна гэтага ляжыць у няпрытарнаванасьці мадэлю арганізацыі да беларускай рэальнасьці ў Польшчы. Справа ў тым, што калі паўставала беларускае Таварыства, яно брала сабе за ўзор падобную арганізацыю Жыдоў у Польшчы, бяз улічэньня таго факту, што Жыды маюць некалькі сваіх разбудаваных інстытуцыяў, як, прыкладам, навуковы інстытут, тэатр, гістарычны й літаратурны часапісы ды штодзённую газэту; з другога-ж боку — ня ўлічваючы таго, што Жыды жывуць расьцярушана, а Беларусы Беласточчыны — кампактнай масай. Пры такіх-жа розных умовах мусяць быць і розьніцы ў структуры арганізацыі. «Дагэтуль, — піша Р. Лясун, — мы трымаемся формаў працы якія выпрацаваны іншымі, ня бачым спэцыфікі нашага становішча, якое дае нам у рукі ўсе козыры».

Амаль поўнасьцяй пагаджаецца з Р. Лясуном В. Юзьвюк у дыскусійным артыкуле «Палепшыць працу Г. П. БГ-КТ» («Ніва», № 39 (135). Ён уважае, што трэба мець асобныя пляны й мэтады дзейнасьці сярод кампактнага беларускага жыхарства ў Беласточчыне, і асобныя формы сярод расьцярушаных Беларусаў на польскай тэрыторыі.

Усе гэтыя пытаньні будуць абмяркоўвацца на ўспомненым Пленуме Галоўнага Праўленьня Таварыства.

✶

14 верасьня г. г. Беларускі самадзейны калектыў песьні й танцу зь Беластоку даў два канцэрты: адзін у Белавежы, другі — у Гайнаўцы.

✶

У верасьні пры Гарадзкім Аддзеле БГ-КТ у Беластоку створаны эстрадны калектыў, які прыступіў да апрацоўкі праграмы.

Зь беларускага жыцьця

Беларуская школа у Нью Брансьвіку

У сыботу 27 верасьня у Нью Брасьвіку пачаліся заняткі ў беларускай школе. Наведвае школу 16 вучняў з Саўт-Рывэру й Нью Брансьвіку. Настаўнікамі ў школе: сп. Ф. Родзька, сп. П. і сп. А. Кароль. Перад адкрыцьцём школьнага году мітрафорны пратаерэй а. Сьцяпан Войтэнка адслужыў малебен і блаславіў дзяцей да добрае навукі. Падчас малебну, апрача дзяцей і настаўнікаў, былі бацькі й старшыня мясцовага аддзелу БАЗА сп. Я. Дубяга. Пасьля малебену настаўнікі зь дзецьмі пачалі заняткі, а бацькі й старшыня БАЗА мелі нараду аб матар'яльным забесьпячэньні школы. Вядзеньне гэтае справы было даручана сп. С. Гутырчыку, культурна-асьветнаму рэфэрэнту БАЗА.

Трэба зазначыць, што школа у Нью Брансьвіку — першая беларуская школа ў Амэрыцы. Запачаткавана была у 1952 годзе ў Саўт-Рывэры, а у 1954 годзе была перанесена ў Нью Брансьвік, дзе йснуе й па сяньняшні дзень. Склад вучняў і настаўнікаў што год мяняўся, за выняткам аднае-дзьвёх асоб сталых наведвальнікаў.

У школе выкладаюцца: рэлігія, сьпеў, беларуская мова, гісторыя й геаграфія Беларусі.

Пры школе Жаночая Сэкцыя вядзе лекцыі беларускіх народных танцаў.

Ф. Р.

Віктар Ракаў

ЛІРЫЧНАЕ

Калі вясна ў душу маю паселіць
Сьпеў жаўрука і бэзавы букет,
Калі на ўзьлесьсі за мяжой аселіц
Шукаю новага радка ў санэт;
Калі пастух на золку будзіць рогам
Сяло і гоніць статак на расу
І васілёк у жыце ля дарогі
Мне дорыць непаўторную красу;
Калі зьбіраю ўсе свае прылады,
Іду на луг, каб сьвежы лёг пракос;
Калі пад вечар халадок спагадай
Агорне потную кучму валос;
Калі іржышча пні на зжатай ніве
Тырчаць грабёнкай — праз усе палі;
Калі у шлях зьбіраюцца тужліва
І ў вырай адлятаюць жураўлі;
Калі пакрые сьнег — утома воку —
Прасторы маёй роднай стараны;
Калі ў шурпатым інеі навокал
Пазвоньваюць галінкі на зары
І пад страху хаваецца ў зацішак
Ад холаду надзьмуты верабей;
Калі ў адлігу мяккі ветрык ліжа
Званочкі ледзяныя на вярбе;
Калі, цяплом ласкавым эноў сагрэты,
На сьцежках талых пакідаю сьлед, —
Тады здаецца, што ў драбніцах сьвету,
Я сам разросься аж на цэлы сьвет.

УВАГА! БЕЛАРУСЫ НЬЮ ЁРКУ Й ВАКОЛІЦАЎ!

Слухайце

Беларускія радыёвыя перадачы

з радыястанцыі WPOW, на хвалі 1330 кц.
Беларускія паўгадзінныя праграмы перадаюцца **штонядзелі ад 8.30 да 9.00 гадзіны ўраньні** і складаюцца зь
беларускіх песьняў,
гутарак на культурна-асьветныя тэмы,
вестак з грамадзкага жыцьця,
рэклямаў беларускіх выданьняў ды ін.

Слухайце й пішэце на адрыс:

BYELORUSSIAN RADIO PROGRAM
41 East 42 Street
NEW YORK, N. Y.

ПОШУКІ

Шукаю роднага брата Юрку (Георгія) родам з Бабруйску. Весткі перасылаць на адрас:

Mr. P. Zhuk
314 so. Clinton Awe.
Trenton 9, N. J.. USA

УВАГА! УВАГА!

Выйшла ўжо з друку новая кніга
Выдавецтва «Бацькаўшчына»
Проф. Я. Станкевіча

Зь гісторыі Беларусі

Кніга зьмяшчае шэсьць наступных разьдзелаў аб мінуласьці нашае Бацькаўшчыны:

1. Беларускія гаспадары (вялікія князі), што не хацелі гаспадарствацъ у чужых;
2. Вялікі князь Алег Северскі;
3. Імсьціслаў Харобры і Імсьціслаў Удалы;
4. Вонкавая гісторыя беларускага права ў розных порах гісторыі Беларусі;
5. Беларускае нацыянальнае адраджэньне (1902—1915);
6. Гісторыя Беларусі і расейская чорная сотня.

Кніжка мае 112 бачынаў друку й каштуе: у Задзіночаных Гаспадарствах Амэрыкі й Канадзе — 95 цэнтаў; у Вялікабрытаніі, Аўстраліі й Новай Зэляндыі — раўнавартасьць 70 цэнтаў; у Эўропе — з выняткам Вялікабрытаніі — і Паўднёвай Амэрыцы — раўнавартасьць 60 цэнтаў.

Купляць і вынісваць можна або беспасярэдна з Выдавецтва «Бацькаўшчына» ў Мюнхэне або ад Прадстаўніцтваў «Бацькаўшчыны» ў розных краінах расьсяленьня Беларусаў.

За кніжку «Зь гісторыі Беларусі» трэба разьлічвацца зь ейным аўтарам Я. Станкевічам, пасылаючы яму грошы на адрыс Крывіцкага (Беларускага) Навуковага Таварыства, гэтак:

J. Stankevich, c/o Fr. Skoryna Society, 6 Vandervoort Place, Brooklyn 37, N.Y. U.S.A.

ДА ЎВАГІ НАШЫХ ПРАДСТАЎНІКОЎ і ЎСЯГО БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДЗТВА!

Выдавецтва «Бацькаўшчыны» зьніжае на 25% цану ўсіх сваіх выданьняў за выняткам «Спадчыны» Я. Купалы ў цьвёрдай вокладцы, «Беларускіх казак» у цьвёрдай і мяккай вокладцы й «Выбраных твораў» Р. Крушыны. У выніку цана ўсіх выданьняў наступная:

Янка Купала
СПАДЧЫНА
— Выбар паэзіі зь вялікім крытычным артыкулам **Ст. Станкевіча.** Балонаў 564. **Цана 5.25, 9, або 11 амэр. даляраў** (залежна ад вокладкі й паперы).

Янка Купала
ТУТЭЙШЫЯ
— П'еса ў чатырох дзеях з крытычным артыкулам **Р. Склюта.** Балонаў 83. **Цана 1 амэр. даляр.**

Янка Купала
РАСЬКІДАНАЕ ГНЯЗДО
— Драма ў пяцёх актах з крытычным артыкулам **Р. Склюта.** Балонаў 58+XV. **Цана 0.75 амэр. даляра.**

Якуб Колас
НОВАЯ ЗЯМЛЯ
— Паэма зь вялікім крытычным артыкулам **Р. Склюта.** Балонаў 246+XXXII. **Цана 2.25 амэр. дал.**

Якуб Колас
СЫМОН МУЗЫКА
— Паэма з крытычным артыкулам **Р. Склюта і А. Бабарэкі.** Балонаў 238. **Цана 2.25 амэр. даляраў.**

Якуб Колас
У ПАЛЕСКАЙ ГЛУШЫ
— Повесьць. **Цана 1.50 амэр. дал.**

Андрэй Мрый.
ЗАПІСКІ САМСОНА САМАСУЯ
— Сатырычная аповесьць з крытычным артыкулам **Р. Склюта.** Балонаў 88. **Цана 0.75 амэр. даляра.**

Лукаш Калюга
НЯДОЛЯ ЗАБЛОЦКІХ
— Аповесьць з крытычным артыкулам **Р. Склюта. Цана 1.10 амэр. даляраў.**

Власт (Вацлаў Ластоўскі)
ТВОРЫ
— Апавяданьні. Балонаў 112. **Цана 0.75 амэр. даляра.**

Юрка Віцьбіч
ПЛЫВЕ З-ПАД СЬВЯТОЕ ГАРЫ НЁМАН
— Мастацкія нарысы. **Цана 0.75 амэр. даляра.**

Рыгор Крушына
ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ
— Вершы. **Цана 2 амэр. даляры.**

ЛЯ ЧУЖЫХ БЕРАГОЎ
— Альманах твораў эміграцыйных паэтаў і пісьменьнікаў з уступным артыкулам **Ст. Станкевіча.** Балонаў 238. **Цана 2. 25 амэр. даляраў.**

БЕЛАРУСКІЯ КАЗКІ
Зборнік народных казак і літаратурных твораў з казачнымі матывамі. Балонаў 215. **Цана 8 або 4 даляры** (залежна ад вокладкі).

Заўвага: У эўрапэйскіх краінах, паймекна ў Англіі, Францыі, Бэльгіі, Нямеччыне, Італіі, Гішпаніі, а таксама ў Аргэнтыне, Бразыліі й Аўстраліі выданьні каштуюць на 20% таней вышэй пададзенае расцэнкі

Выдавецтва «Бацькаўшчына»

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Беларускі тыднёвік палітыкі, культуры й грамадзкага жыцьця.
Выдавец: Уладзімер Бортнік
РЭДАГУЕ КАЛЕГІЯ

Артыкулы, падпісаныя прозьвішчамі або ініцыяламі аўтара, не заўсёды выражаюць пагляды Рэдакцыі.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011